ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 07 2015 г.

Выпрабавана на сабе

# Маці і старэйшая сястра на 18 дзён

## Наша аўтарка правяла іх у дзіцячым лагеры

**Калі я была школьніцай, кожнае лета адпачывала ў дзіцячых аздараўленчых лагерах. Было весела і запамінальна! Гэтым летам мне захацелася зноў паехаць у лагер, толькі цяпер ужо не на адпачынак, а працаваць.**

Сябры вельмі здзівіліся, калі даведаліся пра маё жаданне. «Навошта табе гэта?», «Ну і які з цябе педагог?» — даводзілася чуць ад іх. Але жаданне спазнаць новае, паспрабаваць свае сілы ў іншай сферы дзейнасці было моцным, у дадатак захацелася даказаць навакольным, што я не «лыкам шытая» і змагу дасягнуць пастаўленай мэты.

Працоўнае месца шукала праз інтэрнэт. Дапамог сайт БРСМ, дзе ў раздзеле «Праца» быў змешчаны спіс дзіцячых аздараўленчых летнікаў, якім патрабаваліся студэнты ў якасці выхавальнікаў. Я адправіла па электроннай пошце сваё рэзюмэ ў некалькі раённых камітэтаў БРСМ. У выніку мяне запрасілі на працу ў лагер «Нёман», што знаходзіцца побач з вёскай Каўшова ў Мастоўскім раёне.

Для таго, каб працаваць выхавальнікам у лагеры, аднаго жадання мала. Неабходна здаць дзясятак медыцынскіх аналізаў: да дзяцей абы-каго не дапусцяць. Першае пытанне працадаўцаў тычылася майго ўзросту, бо ў лагеры адпачываюць дзеці і падлеткі 16-17 гадоў...

Выхавальніцкі калектыў сабралі ў лагеры за дзень да пачатку змены. Тады я і высветліла, што працаваць давядзецца побач з будучымі педагогамі і маладымі спецыялістамі, якія толькі пачалі свой настаўніцкі шлях. Напрыканцы першай «планёркі» дырэктар летніка Алена Францаўна Лючык сказала вельмі трапныя словы: «Будзьце пільнымі! І не забывайце, што вольны час у вас будзе толькі пасля адбою і да пад'ёму дзяцей». На справе так і атрымалася.

У мае абавязкі ўваходзіла праца з дзецьмі ў атрадах тады, калі ў іх выхавальніка былі выхадныя, і падрыхтоўка некалькіх мерапрыемстваў. У цэлым за 18 дзён я паспела прымераць на сабе вельмі розныя ролі. Для самых маленькіх дзетак прыйшлося быць маці, для падлеткаў — старэйшай сястрой, а на рэпетыцыях канцэртаў — аб'ектыўным крытыкам. Але пра ўсё па парадку.

Ужо ў першы дзень змены мы разам з калегамі сутыкнуліся з цяжкасцямі. Дзяцей усіх узростаў не цікавіла нічога, акрамя смартфонаў і планшэтаў. Цяпер гэта не дзіўна, тым больш калі нават ты, выхавальнік, пастаянна трымаеш у руцэ гаджэт. «Станьце прыкладам», — успомнілася мне ці то з рэкламы, ці то са школы. Я ўзяла мяч і разам з адной дзяўчынкай пайшла на валейбольную пляцоўку; праз 10 хвілін да нас далучыліся яшчэ некалькі чалавек, праз паўгадзіны падышлі яшчэ. Гэта была хоць маленькая, але перамога!

Увогуле, быць прыкладам для дзяцей даводзілася пастаянна. У тваім пакоі чыста — і дзеці імкнуцца навесці парадак, ты з'ядаеш у сталовай усё — і дзеці паказваюць табе пустыя талеркі, ты ў ціхі час спіш — і яны засынаюць.

Летні лагер для многіх дзяцей — месца, дзе яны ўпершыню могуць адчуць сябе самастойнымі. Але ў большасці выпадкаў дзеці да гэтага не гатовыя. Менавіта выхавальнік сочыць за тым, каб усе 25 выхаванцаў ранкам пачысцілі зубы, увечары памылі ногі; дзяўчаткам абавязкова трэба рабіць прычоскі. А калі ўзнікае неабходнасць, ты павінен памыць дзіцячую бялізну. Пра стомленасць забудзься. Да таго ж дзеці ўсё адчуваюць, яны заўважаюць кожную дробязь. Аднойчы, калі я працавала ў атрадзе самых маленькіх, перад адбоем да мяне падышоў хлопчык Юра і спытаў: «А колькі ў вас дзяцей? Вы клапоціцеся пра нас так, нібыта мы вашыя, родныя...» Напэўна, гэта было самае нечаканае і ў той жа момант самае прыемнае, што мне даводзілася пачуць ад дзіцяці.

Кажуць, што калі ты педагог, дык да ўсіх дзяцей павінен ставіцца аднолькава, але я зразумела, што гэта немагчыма, хаця б таму, што ўсе дзеці розныя. Так, напрыклад, самае цеснае сяброўства ў мяне завязалася з Захарам Маркачанкам з аляхунскай сям'і. Хлопчык прыехаў у «Нёман» ужо трэці раз, і супрацоўнікі лагера папярэдзілі выхавальнікаў, што з ім будзе няпроста. І сапраўды: калі ўсе ішлі на мерапрыемства, ён уцякаў на арэлі, падчас дыскатэкі сядзеў у альтанцы. Такім паводзінам я знайшла толькі адно тлумачэнне: дзіця патрабуе ўвагі да сябе. Мы заклікалі хлопчыка да ўдзелу ва ўсіх магчымых гульнях і спаборніцтвах і нават не заўважылі, што праз некаторы час ужо не маглі без яго абыходзіцца.



Камандзіры атрадаў уздымаюць сцяг лагера на адкрыцці змены.

Змена доўжылася толькі 18 дзён, а мне здаецца, што я паспела пражыць маленькае асобнае жыццё. Побач з дзецьмі атрымалася не толькі ўспомніць, як гэта — быць бесклапотнай, але і зразумець, што такое сапраўдная адказнасць за кагосьці, акрамя сябе. І няхай у мяне няма педагагічнай адукацыі, спадзяюся, што дзеці змаглі ад мяне чаму-небудзь навучыцца. Бо, як казаў знакаміты пісьменнік і педагог Антон Макаранка: «Выхаванне ў тым і заключаецца, што больш дарослае пакаленне перадае свой досвед, свае захапленні, свае перакананні малодшаму пакаленню»...

**Ганна КУРАК, студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.**
**Фота аўтара.**

З досведу актыўных

# САМАКІРАВАННЕ: АД ІДЭІ ДА ПРАЕКТА

**Братэрства арганізацый студэнцкага самакіравання (БАСС) арганізавала ў Мінску «Летнюю сустрэчу актыўных студэнтаў», якая аб'яднала прадстаўнікоў не толькі сталічных, але і абласных ВНУ. Актывісты разам з валанцёрамі і экспертамі, якіх запрасілі, на працягу трох дзён спрабавалі разабрацца ў пытаннях самакіравання.**

Першакурснік БНТУ Дзмітрый Рапапорт удзельнічае ў сустрэчах БАСС ужо другі раз. «Падабаецца атмасфера: тут яна вучэбная і ў той жа час гульнявая. Лекцыі чытаюць на нязвыклыя тэмы, такіх ва ўніверсітэтах няма. Асабліва спадабалася выступленне эксперта з Літвы, які расказваў пра Балонскі працэс, — дзеліцца ўражаннямі хлопец. — Прыемна, што ўсе ўдзельнікі актыўныя, ніхто не адседжваецца ў куточку, кожны мае сваю думку».

Старшы выкладчык юрыдычнага факультэта БДУ Яраслаў Кот прачытаў студэнтам лекцыю «Этыка: даступна пра галоўнае», падчас якой на прыкладах растлумачыў ключавыя паняцці гэтай навукі. Яраслаў расказаў пра сваё навучанне ў ЗША, Вялікабрытаніі і Расіі, падзяліўся ўласнымі назіраннямі за сістэмамі самакіравання за мяжой і іх уплывам на адукацыю. Выкладчык звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што на Захадзе прэстыж дыплома вну залежыць яшчэ і ад саміх выпускнікоў, якія нават пасля заканчэння вучобы клапоцяцца пра сваю альма-матар.

— На «Летнім сустрэчы» я ўпершыню пачуў пра методыку форум-тэатра, якая дапамагае пераконваць людзей. Упэўнены, што аднойчы мне гэта абавязкова спатрэбіцца. Таксама карыснымі былі заняткі па аратарскім майстэрстве. Кожны лідар, у тым ліку студэнцкі, павінен ім валодаць, — расказвае Артур Пазняк, студэнт II курса біялагічнага факультэта БДУ.

Адзін са значных плюсоў семінара — тое, што ён накіраваны не толькі на атрыманне ведаў удзельнікамі ад валанцёраў, але і на абмен досведам паміж навучэнцамі розных устаноў.

Трэба адзначыць, што падобныя мерапрыемствы БАСС праводзіць некалькі разоў на год, пачынаючы з 2009-га (інфармацыю пра іх можна знайсці на афіцыйным сайце і ў суполках сацсетак). Нярэдка ідэі, якія з'яўляюцца ва ўдзельнікаў падчас сустрэч, пасля пераўтвараюцца ў сур'ёзныя праекты ва ўніверсітэтах.

**Ганна КУРАК.**

# БЫЦЬ У СЯДЛЕ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар «ЧЗ».)*

Каб не так хваляваліся. Дарэчы, самым распаўсюджаным аргументам, чаму мама і тата не хочуць аддаваць сваё дзіця ў конны спорт, з'яўляецца яго траўматычнасць.

— У кожным відзе спорту ёсць свае нюансы. І рызыка будзе заўсёды. Гэта нармальна. Іншая справа, як зрабіць так, каб непрыемных сітуацый амаль не было. З гэтай задачай у нас добра спраўляюцца трэнеры, — тлумачыць **начальнік вучэбна-спартыўнага аддзела РЦАП коннага спорту і конегадоўлі Святлана СІРОТКІНА.**

Другая змена дзённага коннаспартыўнага лагера сабрала 30 юных наезнікаў. Усе яны — выхаванцы цэнтра. Ліпеньская змена праводзіцца для тых, хто займаецца конным спортам трэці-чацвёрты год. Кожны з такіх падлеткаў ужо прайшоў пачатковую падрыхтоўку і трапіў у адно з трох спартыўных аддзяленняў: трохбор'я, выездкі ці пераадолення перашкод. Каня для заняткаў і ўдзелу ў спаборніцтвах хлопцам і дзяўчатам прадастаўляе цэнтр. Дзеці шмат трэніруюцца і абавязкова сочаць за здароўем свайго сябра.

— Я дзесяць гадоў займалася акрабатыкай, але заўсёды марыла быць бліжэй да коней. І вось калі бацькі вырашылі пераехаць у Мінск, адразу ўзгадала пра Ратамку. Спачатку было цяжка звыкнуцца з тым, што пасля заняткаў адразу дадому не пабяжыш. Чаму? Таму што каня, як інвентар, на паліцу не пакладзеш. Жывёлу трэба супакоіць, памыць, пачысціць, — расказвае выхаванка цэнтра Паліна Дунаева.

І сапраўды, падлеткі шмат часу аддаюць любімаму занятку. Здаецца, яны правялі б каля коней увесь дзень!

## ДАВЕР ЯК ГАРАНТЫЯ ПОСПЕХУ

Любы летнік — гэта, безумоўна, аздараўленне. А спартыўна-аздараўленчы лагер яшчэ і добрая магчымасць для юных наезнікаў зразумець усю спецыфіку гэтага спорту, трэнерам — лепш прыгледзецца да задаткаў сваіх выхаванцаў.

— Як вы лічыце, — звяртаецца да мяне **Уладзімір КРАЕЎСКІ, трэнер аддзела трохбор'я,** — што ў конным спорце самае цяжкае?

— Напэўна, утрымацца ў сядле, каб падчас спаборніцтваў і розных трукаў не апынуцца на зямлі...

— У чымсьці вы маеце рацыю. Але каб не зваліцца з каня, трэба не проста моцна трымацца, а перш за ўсё неабходна навучыцца давяраць жывёле. Вы павінны прыручыць яе, дабіцца ад яе паслухмянасці.

Першая палова дня ў лагеры — гэта трэніроўкі. Летам іх больш за тры гадзіны. Гэта, як лічаць падлеткі, не шмат, але і ў вольны час таксама можна быць побач з любімымі жывёламі.

**«Каб не зваліцца з каня, трэба не проста моцна трымацца, а перш за ўсё неабходна навучыцца давяраць жывёле. Вы павінны прыручыць яе, дабіцца ад яе паслухмянасці».**

— У маёй бабулі ў вёсцы ёсць конь. Я з ім пасябравала, але ісці ў канкур жывёла не хоча. Не прывыкла яна да гэтага! Яе праца іншая — воз цягнуць, па гаспадарцы дапамагаць, — жартуе выхаванка цэнтра Ліяна Кароткіх.



Юныя спартсмены даглядаюць сваіх чатырохногіх напарнікаў з пяшчотай і клопатам.

Фота Надзеі БУЖАН.

Цікава, што ўсе коні цэнтра выведзены на мясцовым конным заводзе і належаць да асаблівай тракененскай пароды. У музеі коннага спорту і конегадоўлі асобны стэнд прысвечаны гісторыі гэтай пароды і найлепшым яе прадстаўнікам. Дарэчы, менавіта ў Ратамцы праходзіла падрыхтоўку Ірына Ліс, спартсменка, якая прадстаўляла Беларусь на Алімпійскіх гульнях у Афінах і Пекіне.

— Мы не можам гарантаваць, што ўсе выхаванцы цэнтра вырастуць чэмпіёнамі. Але тое, што кожны наезнік набудзе такія якасці, як мэтанакіраванасць, спрытнасць і адказнасць, сказаць магу са стапрацэнтнай упэўненасцю! — дзеліцца Уладзімір Краеўскі.



Давер у спартыўным дуэце — гарантыя поспеху!

## СКАЧУЦЬ НЕ ТОЛЬКІ КОНІ

Другая палова дня ў лагеры — гэта час гульняў і тэматычных вікторын. У вольны час падлеткі з захапленнем чытаюць кнігі пра коней, іх звычкі, асаблівасці характару, глядзяць фільмы, дзе галоўная роля абавязкова належыць іх любімай жывёле. Акрамя гэтага, юныя вершнікі ладзяць сапраўдныя спаборніцтвы паміж сабой. Хлопцы і дзяўчаты вызначаюць, хто з іх самы хуткі, спрытны і вынослівы спартсмен. Дарэчы, перад тым, як пачаць займацца у конна-спартыўным цэнтры, дзеці абавязкова здаюць нарматывы па скачках, адцісканні, бегу.

— Аднойчы да нас прыйшла незадаволеная бабуля з пытаннем: «Навошта маёй унучцы бегаць і скакаць? Гэта ж коні павінны рабіць, а не людзі!» Насамрэч без фізічнай падрыхтоўкі ў гэтым спорце ніяк не абысціся, а яна ў цяперашніх дзяцей вельмі слабая, — распавядае Святлана Сіроткіна. — Як наезнікі збіраюцца кіраваць конямі, калі самі прабегчы сто метраў без моцнай задышкі не могуць?!

Выхаванцы цэнтра і трэнеры расказваюць, што верхавая язда танізуе ўвесь арганізм, асабліва сэрца і сасуды, нармалізуе работу дыхальнай сістэмы. Акрамя таго, паездкі верхам станоўча ўплываюць не толькі на фізічны стан арганізма, але яшчэ і на псіхіку. Такія рэгулярныя заняткі здольны пазбавіць чалавека ад дэпрэсіі і бяссонніцы.

— Заўсёды думала, што ў конным спорце больш хлопцаў, чым дзяўчат. Але цяпер бачу, што гэта не так. За ўвесь час знаходжання ў лагеры не сустрэла ніводнага юнака! — здзіўляюся я.

— Дзяўчаты больш адказныя і клапатлівыя. А коням гэта неабходна! Да таго ж смеласці і зацятасці ў прыгожай паловы чалавецтва дастаткова! У конным спорце вынікаў адразу не даб'ешся, але калі ўпэўнена і доўга ісці да сваёй мэты — усё абавязкова атрымаецца, — тлумачыць Уладзімір Краеўскі.

Ці стануць сённяшнія выхаванцы лагера ў Ратамцы чэмпіёнамі коннага спорту, пакуль невядома. Але з упэўненасцю можна сказаць, што юныя спартсмены добра ведаюць сваю справу і адчуваюць тых, каго яны завуць сваімі напарнікамі.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**